

КАЛІ ПРАМАХНУЦЦА ЦЯЖЭЙ, ЧЫМ ПАПАСЦІ

ЧЫРВОНКА

АДНО «КРЫЛО» НА ДВАІХ

ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 КАСТРЫЧНІКА 2020 г. ЧАЦВЕР № 201 (29315)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Сёння многае зроблена для шматдзетных сем'яў. За апошнія дзесяць гадоў іх колькасць павялічылася практычна ў два разы. У краіне пражывае больш за 110 тысяч такіх сем'яў, дзе выхоўваецца каля 360 тысяч дзяцей, або 19 % ад іх агульнай колькасці. Амаль кожнае пятае дзіця сёння расце ў шматдзетнай сям'і».*

## КОРАТКА

• **Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка на прадпрыемстве «Нафтан» азнаёміўся з ходам рэалізацыі інвестыцыйнага праекта, праблемнымі пытаннямі і перспектывамі дзейнасці.**

• Рэгіянальныя адборы да XXX Міжнароднага фестываля мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» пройдуць у Беларусі з 12 лістапада да 11 снежня.

• **Мінпрацы абмяркоўвае змяненні ў Працоўны кодэкс для паляпшэння ўмоў сумяшчэння кар'еры з сямейным жыццём.**

• Скульптурную кампазіцыю «Мамам і дзецям» адкрылі на тэрыторыі 5-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска.



• **Расія павялічвае частату рэйсаў у Беларусь, Швейцарыю, ААЭ і на Мальдывы, а таксама аднаўляе авіязносіны з Сербіяй, Кубай і Японіяй.**


ISSN 1990 - 763X


# Жураўлі ў аб'ектыве ляцяць





У ваколіцах балота Ельня, а гэта, між іншым, побач з Мёрамі, цяпер уладараць чароды пералётных жураўлёў. Асабліва на тых палетках, на якіх была пасеяна кукуруза. Па падліках супрацоўнікаў рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Ельня» і тамтэйшых валанцёраў, на балотны масіў гэтымі днямі прыляцелі да шасці тысяч асобін гэтых птушак. Кожны дзень, асабліва ў выхадныя, тут збіраюцца ахвотныя (іх колькасць з году ў год расце) паназіраць за крылатымі «чырвонакніжнікамі». Гасцей суправаджае галоўны захавальнік Ельні — дырэктар самага вядомага ў краіне заказніка Іван БАРОК *(на фота ў цэнтры).*

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Энергетыка

# Электрамагутная будучыня

**500 МВт на біяпаліве, 750 МВт — на аднаўляльных крыніцах, стратэгія нізкавугляроднага развіцця**



Фота БелТА.

**Наступнае пяцігоддзе праз увод у эксплуатацыю Беларускай АЭС надасць новае развіццё электратэхналогіям, якія дазволяць поўнасцю выключыць з паліўна-энергетычнага балансу краіны прыродны газ і нафтапрадукты і заменяць іх сабой. У сваю чаргу гэта прывядзе да развіцця аднаўляльных крыніц энергіі (АКЭ) і іх інтэнсіўнай інтэграцыі ў энергасістэму Беларусі. Прагназуецца таксама з'яўленне новых прарыўных тэхналогій не толькі ў паліўна-энергетычным балансе, але і ў будаўніцтве, і прамысловасці, што дазволіць максімальна адысці ад імпарту вуглевадародаў. Гэта звязана і з міжнароднымі абавязацельствамі Беларусі па змяншэнні выкідаў $CO_2$ у атмасферу. Пра будучыню аднаўляльнай энергетыкі краіны на прэс-канферэнцыі расказалі эксперты.**

## РЭЗЕРВЫ АДНАЎЛЯЛЬНЫХ КРЫНІЦ

Як вядома, Беларусь імпартуе большую частку сваіх энергарэсурсаў — да 84 % усіх вуглевадародаў пастурае да нас з-за мяжы. Таму ў краіне праводзіцца палітыка энергазберажэння і ўкаранення аднаўляльных крыніц энергіі (АКЭ), нагадаў **Міхаіл МАЛАШАНКА, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі, дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці.**


СТАР. 2


На слыху

# Выпрабоўванні вакцын: падводныя камяні

У добра інфармаваных добраахвотнікаў не павінна быць завышаных чаканняў



**11 жніўня была зарэгістравана першая ў свеце вакцына ад каранавіруса «Гам-КОВІД-Вак-2020» (гандлёвая назва «Спадарожнік V»), распрацаваная ў расійскім Нацыянальным даследчым цэнтры эпідэміялогіі і мікрабіялогіі імя М.Ф. Гамалеі. А ў пачатку кастрычніка 100 беларускіх грамадзян далучыліся да трэцяй клінічнай фазы выпрабоўвання гэтага прэпарата. Ці варта было спяшацца і наколькі апраўдана рэгістрацыя вакцыны да завяршэння клінічнай фазы? Што думае сусветная навуковая супольнасць аб расійскай вакцыне? Ці будуць захаваныя правы беларускіх валанцёраў, што далучыліся да яе выпрабоўванняў і неабходныя этычныя працэдуры? Усе гэтыя пытанні аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў анлайн-дыскусіі, арганізаванай Рэспубліканскім цэнтрам біяэтыкі.**


СТАР. 4

Жыллё

# Смалявічы ў будоўлі, Рудзенск — у планах

## Як будуюцца гарады-спадарожнікі

**Па звестках на сённяшні дзень, усяго на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у Мінску знаходзіцца больш за 190 тысяч сем'яў, з іх шматдзетных — каля шасці тысяч. Менавіта ў сталіцы жыллёвае пытанне нават для апошняй катэгорыі стаіць найбольш востра — яны часам чакаюць у чарзе больш за два ці тры гады.**

Улічваючы, што на тэрыторыі Мінска практычна адсутнічаюць свабодныя зямельныя ўчасткі, прыдатныя для будаўніцтва жылля, неабцяжараныя зносам аб'ектаў нерухомасці і неабходнасцю рэалізацыі маёмасных правоў уласнікаў, Мінгарвыканкам сумесна з Мінаблвыканкамам пачаў асваенне горада-спадарожніка Смалявічы. Менавіта ў ім для мінчан плануюць пабудаваць 19 дамоў, паведаміў журналістам намеснік старшыні камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Дзяніс Нікіцін у прэс-цэнтры БелТА.

### Сталіца не гумавая

Сёння ў Мінску на рознай стадыі будаўніцтва знаходзіцца 145 жылых дамоў агульнай плошчай 1,6 мільёна квадратных метраў. Найбольш маштабнае будаўніцтва вядзецца ў Кастрычніцкім раёне сталіцы, дзе ўзводзіцца каля 700 тысяч жылых «квадратаў», што складае больш за 40 % ад усяго аб'ёму жыллёвага будаўніцтва ў горадзе.

Па аператыўных даных, сёлета за студзень — верасень у Мінску ўвялі ў эксплуатацыю 31 шматкватэрны жылы дом агульнай плошчай 385 тысяч квадратных метраў. У прыватнасці, па сем жылых дамоў уведзена ў Першамайскім і Кастрычніцкім раёнах, пяць — у Заводскім, чатыры — у Маскоўскім, па тры — у Ленінскім і Фрунзенскім, два — у Цэнтральным раёне. Акрамя таго, 19 жылых дамоў аднакватэрнага тыпу ўзведзена па індывідуальных праектах, 12 — у канструкцыях буйнапанэльнага домабудавання.

Асноўнымі пляцоўкамі для ўзвядзення жылля ў сталіцы з'яўляюцца мікрараёны Лошыца і Чыжоўка, забудова Мінск-Мір, а таксама тэрыторыі ў межах вуліц Шарангові ча — Гарэцкага і Шышкіна — Куляшова, адзначыў прадстаўнік Мінгарвыканкама.

Яшчэ літаральна пяць гадоў таму ў Мінску будавалася да аднаго мільёна квадратных метраў жылля ў год, але свабодныя зямельныя ўчасткі ў межах горада хутка скончыліся. Цяпер забудова сталіцы цэлымі кварталамі вядзецца ўжо не такімі тэмпамі. Сёлета запланавана ўзвядзенне жылля аб'ёмам крыху больш за 600 тысяч квадратных метраў. На думку Дзяніса Нікіціна, гэты паказчык комплекснага будаўніцтва жылля ўдасца захаваць і ў наступныя гады, але прыкладна з 2025-га лічбы могуць быць скарэктаваны ў меншы бок.

### Амаль 2,5 тысячы кватэр у прысталіччы

Сёння ў Смалявічах разгарнулася грандыёзная будоўля адразу ў двух кварталах. Калі ў квартале нумар адзін узвядзенне жылля вядзецца Мінскім аблвыканкам для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у Смалявічах, то другі квартал да мясцовых жыхароў ніякага дачынення не мае. Гэты ўчастак забудоўваецца Мінгарвыканкамам для грамадзян, якія стаяць на жыллёвым уліку ўжо ў Мінску. На тэрыторыі другога квартала прадугледжана будаўніцтва 19 жылых дамоў агульнай плошчай 146 тысяч квадратных метраў на 2200 кватэр.

Гэта ў планах, а што робіцца ў новым квартале цяпер? Тут на стадыі завяршэння знаходзіцца будаўніцтва жылога дома на 192 кватэры агульнай плошчай 14 тысяч квадратных метраў. Акрамя таго, па двух шматкватэрных дамах распрацавана праектная дакументацыя, якая ва ўстаноўленым парадку прайшла дзяржаўную экспертызу. Да канца года мінскія спецыялісты плануюць завяршыць праектныя работы з атрыманнем экспертнага заключэння яшчэ па чатырох дамах.

Мяркуецца, што кошт аднаго «квадрата» ў кватэрах новых дамоў складзе прыкладна 1100—1200 рублёў. Усе дамы будуць у серыях буйнапанэльнага домабудавання.



На гэтыя мэты грамадзяне змогуць атрымаць крэдытныя рэсурсы ў адпаведнасці з указам № 240. Акрамя таго, Дзяніс Нікіцін нагадаў, што пры будаўніцтве жылля ў гарадах-спадарожніках для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, аказваецца дзяржаўная падтрымка ў выглядзе льготных крэдытаў незалежна ад даты пастаноўкі на ўлік.

Але як жа будзе вырашана пытанне з фінансаваннем, калі крэдытаванне насельніцтва пад будаўніцтва жылля прыпынена па ўсіх праграмах? На гэтую рэпліку карэспандэнта «Звязды» Дзяніс Нікіцін адказаў, што, паводле папярэдніх рашэнняў па фінансаванні гэтых дамоў, Беларусбанк будзе выдаваць крэдыты чаргавікам менавіта згаданых будоўляў. Пэўная сума крэдытных сродкаў на такія мэты на гэты год зарэзерваваная.

Цяпер таксама вядуцца праектныя работы па дзіцячым садзе і школе, фінансаванне праектавання і будаўніцтва, а таксама інжынерна-транспартнай інфраструктуры ажыццяўляецца за кошт сродкаў бюджэту Мінска шляхам пералічэння міжбюджэтнага трансферту ў рэспубліканскі бюджэт. На сённяшні дзень аб'ём пералічанага міжбюджэтнага трансферту складае восем мільёнаў рублёў.

Акрамя Смалявіч як перспектыўная пляцоўка для будаўніцтва жылля для мінчан разглядаецца Рудзенск. Пляцоўка і сапраўды вельмі перспектыўная, вось толькі з фінансаваннем згаданага праекта, хутчэй за ўсё, прыйдзецца нейкі час пачакаць, адзначыў Дзяніс Нікіцін.

Нагадаем, па інфармацыі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, у гарадах-спадарожніках Мінска да 2025 годзе будзе ўзведзена да аднаго мільёна квадратных метраў жылля.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Электрамагутная будучыня

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Налета краіна плануе ўвесці ў эксплуатацыю не менш за 500 МВт цеплагенерыруючых магутнасцяў з выкарыстаннем біяпаліва ў сістэме ЖКГ для забеспячэння патрэб насельніцтва ў цеплаэнергіі. Біяпаліва і цяпер стварае найбольшую частку энергіі ў паліўна-энергетычным балансе. У асобных раёнах выраб цеплаэнергіі ў сістэме ЖКГ з дапамогай гэтай крыніцы дасягае 70—90 %. Аднак у энергабалансе краіны ў цэлым мясцовыя віды паліва (МВП) займаюць толькі 16,5 %. Пры гэтым мяркуецца, што да 2025-га магутнасць установак, што працуюць на АКЭ, дасягне 750 МВт.

— Магутнасць беларускай энергасістэмы складае 10 170 МВт. За восем месяцаў сёлета магутнасць установак, якія працуюць з выкарыстаннем АКЭ, за кошт уводу новых аб'ектаў павялічылася на 82,1 МВт і склала 486,7 МВт. Гэта 4,8 % ад агульнага аб'ёму вырабу энергіі (летась было 4 %), — абазначыў **Сяргей ГРЭБЕНЬ, начальнік упраўлення энергаэфектыўнасці, экалогіі і навукі Міністэрства энергетыкі.**

Летась у паліўна-энергетычным балансе краіны 7,1 % энергіі атрымана з аднаўляльных крыніц. У асобных краінах свету 25—30 % электраэнергіі выпрацоўваецца з дапамогай аднаўляльных крыніц. У нас гэта лічба складае 2 % (ад АКЭ ў энергабаланс паступае 0,9 млрд кВт·г пры сумарным унутраным спажыванні на ўзроўні больш як 38,1 млрд кВт:

— У Беларусі распрацаваны план дзеянняў да 2030 года, існуе шэраг дамоўленасцяў з Міжнародным агенцтвам па аднаўляльным крыніцам энергіі (IRENA), якое гатова аказаць тэхдапамогу і правесці работу адносна магчымасці і павелічэння выкарыстання АКЭ ў Беларусі. Сёння ўстаноўленая электрычная магутнасць мясцовых аднаўляльных крыніц у краіне каля 492 МВт. Паводле міжнародных энергетычных суполак, калі магутнасць АКЭ складае менш за 10 % ад аб'ёмаў усёй энергасістэмы, то яна не ўплывае на збалансаванную работу сістэмы ў цэлым, — расказаў Міхаіл Малашанка.

### Стандарты для ветраўстановак

Забруджанасць паветра і абмежаванасць паліўных выкапняў робяць ветраэнергетыку бадай што самай чыстай аднаўляльнай крыніцай энергіі. Сёння гэта адна з найбольш перспектыўных яе крыніц, якая паспяхова развіваецца і з'яўляецца важным кірункам энергазберажэння, акрэсліла **Аляксандра ШАЎЦОВА-РОНІНА, начальнік аддзела тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі ў электратэхніцы, радыёэлектроніцы і энергазберажэнні Белдзяржінстытута стандартызацыі і сертыфікацыі:**

— Стварэнне ветрапаркаў у краіне — адносна новы кірунак. Для забеспячэння нарматыўнай падтрымкі нашым інстытутам распрацаваны тры міждзяржаўныя стандарты, якія вызначаюць патрабаванні да ветраэнергетычных установак.

Адзін з іх датычыцца патрабаванняў да праектавання ветраэнергетычных установак, іх канструкцый і ўсіх падсістэм. Яго мэта — абараніць установку ад усялякіх уздзеянняў на працягу ўсяго часу існавання. Другі стандарт датычыцца патрабаванняў да малых ветраэнергетычных установак, іх падсістэм і механізмаў. Яшчэ адзін стандарт утрымлівае выпрабаванні на адпаведнасць і сертыфікацыю. Ён заклікаваны аблегчыць узаемнае прызнанне ўдзельнікамі рынку выпрабаванняў і дакументаў аб ацэнцы адпаведнасці, якія выдадзены ў межах розных дзяржаў.

### Сонца, вада і парніковыя выкіды

Беларусь — удзельніца рамачнай канвенцыі ААН аб змяненні клімату. Наша краіна ўзяла на сябе абавязацельства скарацыць да 2030 года выкід парніковых газаў на 28 % у параўнанні з аб'ёмамі 1990-га, таму развіццё АКЭ ў краіне вельмі важнае. Аднак, нягледзячы на тое, што ў 2018-м працэнт скарачэння ўжо дасягнуў 33, праз высокае развіццё прамысловасці і іншых галін эканомікі краіны без дадатковых мер і мерапрыемстваў па зніжэнні выкідаў парніковых газаў, Беларусь можа не дасягнуць заяўленага скарачэння да 2030 года, падкрэсліла **Наталля ГУЛЬНІЦКАЯ, начальнік упраўлення рэгулявання ўздзеянняў на атмасфернае паветра, змяненне клімату і экспертызы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

Летась выкіды ад стацыянарных крыніц склалі 426,1 тысячы тон, з іх 85 тысяч тон — ад спальвання паліва. Сёння краіна мае дастатковы патэнцыял для развіцця аднаўляльнай энергетыкі. Гадавы прыход сонечнай радыяцыі на адзінку плошчы ў нас супастаўны з такімі паказчыкамі ў Германіі ці Польшчы, дзе сонечная энергетыка развіваецца больш высокімі тэмпамі.

— У нас няма такога ветру, як у краінах з моргамі і акіянамі, аднак пры існуючых тэхналогіях нашы паказчыкі па ветры дастатковыя, каб ветраэнергетыка стабільна развівалася. Патэнцыял гідраэнергетычных рэсурсаў краіны каля 250 МВт. Ён сканцэнтраваны ў Гродне, Віцебску і Магілёўскай вобласці каля рэк Нёман, Заходняя Дзвіна і Дняпро, — звярнула ўвагу Наталля Гульніцкая.

**Ірына СІДАРОК.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Продавец** | **ОАО «МОТОВЕЛО», г. Минск, пр-т Партизанский, 8 (тел. +375 44 743 00 30) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 470-18Б/2017** |

**Предмет аукциона**

**Предприятие как имущественный комплекс ОАО «МОТОВЕЛО»** (регистрационный номер 0001427, свидетельство № 3420 от 04 января 2019 г.). Состав имущества и имущественных прав см. на сайте www.cpo.by

Месторасположение производственной базы – **Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, 39, район д. Лесины**

**Начальная стоимость без НДС – 74 689,76 бел. руб.** (снижена на 20 %) Шаг аукциона без НДС – 3 734,49 бел. руб.

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни. Ответственное лицо: Чарный Дмитрий Николаевич, тел. +375 44 743 00 30 |

**Задаток 3 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».**
Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок до 17.00 **05.11.2020** заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 вышеуказанного Закона.
Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.
Порядок оформления результатов торгов: победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение в размере 3 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 15.05.2020 и от 18.07.2020, в журнале «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие» от 01.06.2020 и от 01.08.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 06.11.2020** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. **Заявления на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 15.10.2020 по 05.11.2020 до 17.00** по указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; +375 (44) 704-92-06, www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

З нагоды

# ГІМН БУДУЧЫНІ КРАІНЫ — ДЗІЦЯЧЫ СМЕХ



Фота Марыям ТАБАГАРЫ.

Такое цудоўнае параўнанне зрабіў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ** падчас віншавання прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва з Днём маці. Трыццаць жанчын, з якіх 11 — шматдзетныя маці, былі запрошаны на ўрачысты прыём да губернатара. Яны атрымалі з яго рук яркія букеты, у іх гонар адбыўся невялічкі канцэрт. Шматдзетныя маці, добрасумленныя працаўніцы, грамадскія работніцы — кожная з прысутных дасягнула важкіх поспехаў у выхаванні падрастаючага пакалення і працы на карысць беларускага грамадства. Дзевяці з іх губернатар уручыў Ордэны Маці за выхаванне пяці і больш дзяцей. Усяго ў рэгіёне ордэнам Маці ўзнагароджаны 1183 жанчыны, у тым ліку сёлета — 131.

— Мы ганарымся жанчынамі-маці, якія актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці, добрасумленна працуюць, дасягаюць поспехаў у самых розных сферах і пры гэтым дапамагаюць краіне вырашаць дэмаграфічныя праблемы, — падкрэсліў у сваёй прамове Леанід Заяц. — У Магілёўскай вобласці пражывае амаль 11 тысяч шматдзетных сем'яў. Гэта добры паказчык. Але нам усім хацелася б, каб шматдзетных сем'яў станавілася ўсё больш. Бо шчаслівы дзіцячы смех — гімн будучыні нашай краіны.

У гэты ж дзень у магілёўскім Цэнтры культуры і вольнага часу віншавалі заслужаных магілёўчанак. Мерапрыемствы, прысвечаныя Дню маці, будуць праходзіць у вобласці на працягу тыдня. Адбудуцца сустрэчы, круглыя сталы, будзе арганізавана ўшанаванне сямейных працоўных дынастый, «залатых» і «сярэбраных» юбіляраў, маладых сужэнцаў, віншаванні маладых маці з нараджэннем першынцаў.

Для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, прадугледжаны 11 відаў дзяржаўных дапамог, аказваюцца розныя віды сацыяльнай дапамогі, працягваецца налічэнне «сямейнага капіталу». З 1 студзеня 2015 года правa на яго ў Магілёўскай вобласці атрымалі 9,4 тысячы сем'яў. Акрамя гэтага, сёлета дапамогай да новага навучальнага года скарысталіся амаль 11 тысяч сем'яў, якія выхоўваюць больш чым 20 тысяч школьнікаў. На гэтыя мэты пайшло звыш 1,5 тысячы рублёў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Будзьце ў курсе

# ЗАМЕСТ ЧАТЫРНАЦЦАЦІ ДЗЁН – ДЗЕСЯЦЬ

**Тэрмін самаізаляцыі з нагоды COVID-19 могуць скараціць, паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя**

**Міністэрства аховы здароўя разам з зацікаўленымі падрыхтавала і ўнесла ва ўрад праект пастановы Савета Міністраў ад 13 кастрычніка 2020 г. № 591 «Аб змяненні пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 25 сакавіка 2020 г. № 171 і ад 8 красавіка 2020 г. № 208».**

У праекце прапануецца скараціць тэрмін знаходжання ў самаізаляцыі з 14 да 10 каляндарных дзён з даты апошняга кантакту. Людзям, якія на самаізаляцыі, дазволена ў выпадку крайняй неабходнасці наведваць арганізацыю аховы здароўя для атрымання экстранай або неадкладнай медыцынскай дапамогі.

Таксама прапануецца пашырыць пералік асоб, на якіх не распаўсюджваецца патрабаванні па захаванні самаізаляцыі. Гэта кіраўнікі і члены афіцыйных дэлегацый; асобы, якія едуць па тэрыторыі нашай краіны транзітам і маюць дакументы, што пацвярджаюць выезд на працягу аднаў сутак; грамадзяне Беларусі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Беларусі і прыбылі ў Беларусь пасля знаходжання ў службовай камандзіроўцы з краін, у якіх рэгіструюцца выпадкі інфекцыі COVID-19, а таксама з краін, не ўключаных у пералік, і едуць транзітам праз краіны, уключаныя ў пералік, пры ўмове наяўнасці ў гэтых асоб дакументальнага пацвярджэння транзітнага праезду праз краіну, уключаную ў пералік; асобы, якія ажыццяўляюць перавозкі ствалавых клетак, органаў для трансплантацыі.

Праект пастановы прадугледжвае, што замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства (за выключэннем тых, хто пастаянна пражывае ў Беларусі), якія прыбылі з краін, не ўключаных у пералік, пры перасячэнні беларускай мяжы павінны мець арыгінал медыцынскага дакумента (на рускай, беларускай або англійскай мовах), які пацвярджае адмоўны вынік лабараторнага тэсціравання на інфекцыю COVID-19, зроблены не пазней за 72 гадзіны да даты перасячэння мяжы.

### ЗАПАС ЛЕКАЎ СТВОРАНЫ

У Беларусі створаны запас лекаў і сродкаў аховы на перыяд уздыму рэспіраторных захворванняў, у тым ліку COVID-19, паведаміў **намеснік міністра аховы здароўя Барыс АНДРАСЮК** на круглым стале, прысвечаным развіццю фармацэўтычнай галіны, які прайшоў у прэс-цэнтры БелТА.

— Праведзена вялікая работа, мы сапраўды стварылі запас лекавых сродкаў. Акрамя таго, у дастатковай колькасці закуплены прэпараты з новай лінейкі, якія з'явіліся зусім нядаўна для лячэння інфекцыі COVID-19, — сказаў Барыс Андрасюк.

Запас рэспіратараў, масак, касцюмаў складае ад 45 да 70—100 дзён па розных пазіцыях.

Паводле слоў гендырэктара РУП «Кіруючая кампанія холдынга «Белфармпрам» Сяргея Казакевіча, падрыхтоўка да асенне-зімовага перыяду праходзіла з улікам вопыту так званай першай хвалі каранавіруса.

— Калі казаць пра першую хвалю, то Міністэрствам аховы здароўя быў сфарміраваны пералік прэпаратаў, найбольш запатрабаваных для лячэння пацыентаў з COVID-19. У ім каля 180 пазіцый, у тым ліку каля 150 — беларускай вытворчасці, прычым 80 % з іх — прадукцыя прадпрыемстваў холдынга, — сказаў ён.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## «Саюз» устанавіў рэкорд па хуткасці палёту да МКС



Карабель «Саюз МС-17» даляцеў да Міжнароднай касмічнай станцыі за тры гадзіны тры хвіліны, паведаміў ТАСС. Пры гэтым апарат здзейсніў толькі два абароты вакол Зямлі. Раней такую схему ўжылі на некалькіх грузавых караблях «Прагрэс МС». Самаму хуткаму з іх, каб дабрацца да станцыі, спатрэбілася тры гадзіны 18 хвілін. Традыцыйнай з'яўляецца двухсутачная схема, калі карабель робіць 34 віткі. Учора «Саюз» прыстыкаваўся да модуля «Світанак». На борце знаходзіліся расіяне Сяргей Рыжыкаў і Сяргей Кудзь-Свярчкоў, а таксама амерыканка Кэтлін Рубінс. На арбіце іх сустрэлі расіяне Анатоль Іванішын, Іван Вагнер і амерыканскі астранаўт Крыс Кэсідзі, якія 22 кастрычніка пакінуць станцыю. Новы экіпаж прабудзе ў космасе да 9 красавіка 2021 года. За гэты час касманаўты зробяць два выхады ў адкрыты космас.

## Фанаты ўчынілі пагромы ў ЗША. Сілавікі прымянілі стрэльбы з гумавымі кулямі

Напярэдадні «Лос-Анджэлес Лейкерс» у 17-ы раз стаў пераможцам Нацыянальнай баскетбольнай асацыяцыі. Фанаты зладзілі масавыя гулянні з нагоды свята. Праз некаторы час абстаноўка пачала абвастрацца. Фанаты сталі правакаваць паліцэйскіх, кідаючы ў іх камяні і бутэлькі. Ахоўнікі парадку папярэдзілі, што такія паводзіны будуць мець сур'ёзныя наступствы і запатрабавалі разысціся. Частка балельшчыкаў не падпарадкавалася, працягваючы праяўляць агрэсію. У нейкі момант праваахоўным органам прыйшлося прымяніць конную паліцыю, каб разбіць натоўп на дробныя групы. Таксама сілавікі выкарысталі стрэльбы з гумавымі кулямі. «76 чалавек былі арыштаваны за вандалізм, напад на супрацоўнікаў аховы правапарадку і за нежаданне разыходзіцца. Трое з тых, хто сабраўся, былі параненыя гумавымі патронамі, выпушчанымі нашымі афіцэрамі, і іх даставілі ў бальніцы. Восем паліцэйскіх таксама атрымалі раненні, ім аказалі медыцынскую дапамогу. Натоўп пашкодзіў больш за 30 будынкаў, а таксама гарадскі аўтобус», — адзначаецца ў заяве паліцыі.

## Кіпр закрывае праграму па выдачы «залатых пашпартоў»

Кіпр адмяняе праграму атрымання грамадзянства праз інвестыцыі ў эканоміку краіны з 1 лістапада гэтага года, паведаміла кіпрскае падраздзяленне грэчаскай газеты «Катымерыні». «Улады прынялі рашэнне спыніць дзеянне праграмы «Грамадзянства праз інвестыцыі» ў яе цяперашняй форме», — прыводзіць выданне словы прадстаўніка ўрада Кірыякаса Кушаса. Ён заявіў, што гэтае рашэнне было прапанавана міністрамі ўнутраных спраў і фінансаў, яго падтрымалі і іншыя члены ўрада. Раней тэлеканал «Аль-Джазіра» апублікаваў на сайце відэазапіс, зняты таемна, які дазваляе меркаваць, што ў кіпрскай схеме «залатых пашпартоў» меўся карупцыйны складнік.

БТА БАНК

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2020 г.

**Наименование банка: ЗАО «БТА Банк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2020 | 01.01.2020 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 12 968 | 10 244 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 35 988 | 40 499 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 14 094 | 41 506 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 75 453 | 44 589 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 273 657 | 204 181 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | 233 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 9 916 | 9 751 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 783 | 791 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 1 084 | 733 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 423 943 | 352 527 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 47 130 | 28 250 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 304 952 | 236 188 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 21 010 | 38 971 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 838 | 579 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 373 930 | 303 988 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 24 747 | 24 747 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 1 378 | 1 307 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 8 598 | 8 598 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 15 290 | 13 887 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 50 013 | 48 539 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 423 943 | 352 527 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2020 г.

**Наименование банка: ЗАО «БТА Банк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2020 | 01.10.2019 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 22 029 | 11 600 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 13 265 | 7 406 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 8 764 | 4 194 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 4 401 | 5 889 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 239 | 462 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 3 162 | 5 427 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 213 | (433) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 2 466 | 1 757 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | 232 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 3 562 | 750 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 209 | 189 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 9 045 | 8 721 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 613 | 418 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 1 594 | 1 477 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 120 | 318 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 1 474 | 1 159 |

Председатель Правления Доронкевич А.В.

Главный бухгалтер Ковалева Т.Н.

Дата подписания: 05 октября 2020 г.

УНП 807000071

# Выпрабоўванні вакцын: падводныя камяні



Так выглядаюць ампулы першай у свеце зарэгістраванай вакцыны ад COVID-19, створанай у Расіі. Яны маюць накрыўкі двух розных колераў: чырвонага і сіняга. Адна ампула прызначана для першага ўколу, іншая — для другога.

## ПАДСТАВЫ ДЛЯ НЕДАВЕРУ

— У гонку па стварэнні і выпрабоўванні вакцыны ад каранавіруса ўцягнутыя сёння шмат краін і вытворцаў, — падкрэслівае **дацэнт кафедры інфекцыйных хвароб і дзіцячых інфекцый БелМАПА, кандыдат медыцынскіх навук Мікалай ГАЛАБАРОДЗЬКА.** — У той жа Расіі над сваімі ўнікальнымі вакцынамі працуюць паралельна адразу некалькі даследчых цэнтраў. Па звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, на 17 верасня даклінічную стадыю выпрабоўванняў праходзілі 146 вакцын-кандыдатаў, а клінічную — 36 (з іх толькі дзевяць — трэцюю фазу). Кожны з этапаў распрацоўкі вакцын мае канкрэтныя мэты. Калі ў першай і другой фазах даследуецца бяспека і імуналагічная эфектыўнасць вакцыны, то ў трэцяй вывучаецца клінічная эфектыўнасць прадухілення захворвання і яна носіць больш масавы характар.

Трэба заўважыць, што незадоўга да рэгістрацыі расійскай вакцыны Асацыяцыя арганізацый па клінічных даследаваннях, у якую ўваходзяць вядучыя міжнародныя фармацэўтычныя канцэрны, прасіла Міністэрства аховы здароўя РФ не спяшацца з гэтым крокам. Эксперты палічылі, што ў даследаваннях удзельнічала занадта мала (менш за сотню) людзей, і вакцына не прайшла ўсіх выпрабоўванняў, таму рабіць высновы аб яе эфектыўнасці пакуль заўчасна. Прычынай недаверу стала адсутнасць поўнай і празрыстай інфармацыі пра выпрабоўванні вакцыны. Міжнародныя нормы патрабуюць публікацыі экспертнай ацэнкі справаздачы аб клінічных выпрабоўваннях адначасова з рэгістрацыяй прэпарата. Але першыя афіцыйныя даныя даследавання расійскай вакцыны «Спадарожнік V» былі апублікаваныя толькі 4 верасня ў часопісе The Lancet.

На суд грамадскасці даследчыкі вынеслі вынікі двух пачатковых этапаў яе выпрабоўванняў. Услед за гэтым група навукоўцаў з Італіі, Вялікабрытаніі і ЗША апублікавала адкрыты ліст з шэрагам пытанняў да даных, апублікаваных расійскімі даследчыкамі. У ім, у прыватнасці, звярталася ўвага на статыстычныя анамаліі, якія заўважылі ў некалькіх эксперыментах, апісаных у артыкуле. У прыватнасці, навукоўцы адзначылі, што цітр (узровень) антыцел у крыві добраахвотнікаў пасля імунізацыі ў розных групах супадае, хоць размова ідзе пра людзей, якія атрымалі розныя кампаненты вакцыны.

Таксама звярталася ўвага на недахоп інфармацыі аб пацыентах, якія перахварэлі і з сываратскай крыві якіх параўноўваўся імунны адказ. Параўнанне канцэнтрацыі антыцел у прышчэпленых і перахварэлых — важная характарыстыка: пажадана, каб вакцына давала больш высокія канцэнтрацыі. Тэрмін назірання за добраахвотнікамі быў дастаткова кароткі — 42 дні. А ў першую фазу былі ўключаны пераважна маладыя мужчыны (большасці не было і 40 гадоў). З-за невялікай колькасці ахопленых даследаваннем (афіцыйна даныя апублікаваныя толькі па 76 добраахвотніках) прагучала меркаванне, што даследчыкі маглі пакуль проста не выявіць рэдкія і больш цяжкія рэакцыі. Такім чынам замежныя навукоўцы, што пакінулі свае подпісы пад адкрытым лістом, паставілі пад сумненне даныя аб паспяховых выпрабоўваннях расійскай вакцыны. Яны палічылі, што з пункту гледжання навукі і доказнай медыцыны ацэньваць перспектывы вакцыны «Спадарожнік V» пакуль што рана. І расійскім даследчыкам давялося затым апраўдвацца.

## РАССТАВІЦЬ КРОПКІ НАД «І»

Цікава, што паводле апытання інтэрнэт-сэрвісу «Даведнік урача», у якім удзельнічала больш за тры тысячы расійскіх медыкаў, 52 % з іх паведамілі, што не гатовыя зрабіць прышчэпку ад каранавіруса, створаную ў цэнтры Гамалеі, 66 % апытаных патлумачылі, што даных аб эфектыўнасці вакцыны недастаткова, а 48 % адзначылі, што яе стварылі ў занадта кароткія тэрміны.

— Між іншым, у інструкцыі да вакцыны «Спадарожнік V» запісана, што названы прэпарат зарэгістраваны па працэдуры рэгістрацыі ва ўмовах пагрозы ўзнікнення і ліквідацыі надзвычайных сітуацый, — тлумачыць Мікалай Галабародзька. — Яе стваральнікі прызнаюць, што ахоўны цітр антыцел у цяперашні момант невядомы, працягласць ахоўнага эфекту таксама невядомая, а клінічныя выпрабоўванні па вывучэнні эпідэміялагічнага эфекту вакцыны не праводзіліся. Інструкцыя падрыхтавана на падставе абмежаванага аб'ёму даных па прымяненні прэпарата і будзе дапаўняцца па меры паступлення новых звестак.

У цэлым трэцяя фаза выпрабоўванняў павінна зняць пытанні, якія навуковая супольнасць задавала расійскім даследчыкам пасля публікацыі вынікаў першай і другой фаз у часопісе The Lancet.

Удзел у ёй возьмуць 40 тысяч чалавек. Даследаванні будуць сляпыя і рандамізаваныя. Частка ўдзельнікаў атрымае вакцыну, а частка — плацэба. Пры гэтым ніхто з іх не ведае, хто прышчэплены «пустышкай», а хто — прэпаратам. Праз тры месяцыназіранняў навукоўцы параўнаюць узровень захворвання ў абедзвюх групах. Гэтая інфармацыя і стане ключавой для атрымання пастаяннай рэгістрацыі вакцыны і дасць адказ на пытанне, ці здольная імунізацыя прэпаратам «Спадарожнік V» прадухіліць заражэнне COVID-19 і знізіць колькасць цяжкіх ускладненняў ад каранавіруса.

## БЕЗ СЮРПРЫЗАЎ?

Хоць у свеце рэакцыя на рэгістрацыю Расіяй вакцыны была неадназначная, дырэктар Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) Ханс Клюге па выніках сустрэчы з кіраўніком Расспажыўнагляду выказаў упэўненасць, што трэцяя фаза выпрабоўвання расійскай вакцыны ад каранавіруса, падчас якіх яе бяспека і эфектыўнасць будуць пратэсціраваны на дастаткова вялікай групе людзей, пройдзе паспяхова. Клюге таксама адзначыў «багаты вопыт» Расіі ў галіне распрацоўкі вакцын і вакцынацыі.

Цікавасць да куплі распрацаванай расійскімі спецыялістамі вакцыны ад каранавіруснай інфекцыі праявілі ўжо 27 краін: у іх лік уваходзяць Беларусь, Азербайджан, Бразілія, Венесуэла, Казахстан... Беларусь, дарэчы, стала першай краінай, дзе пройдуць выпрабоўванні вакцыны «Спадарожнік V» пасля яе рэгістрацыі ў Расіі.

— У маі ў Беларусі былі ўнесены змяненні ў Закон «Аб лекавых сродках». Цяпер у нас з'явілася магчымасць так званай умоўнай дзяржаўнай рэгістрацыі, калі арыгінальныя лекавыя прэпараты для лячэння, прафілактыкі ці дыягностыкі захворванняў, якія пагражаюць жыццю ці цягнуць цяжкую інваліднасць, лекавыя прэпараты для лячэння арфанных (рэдкіх) захворванняў пры адсутнасці эфектыўных метадаў аказання медыцынскай дапамогі могуць дапускацца да рэалізацыі і медыцынскага прымянення пасля праходжання працэдуры іх умоўнай рэгістрацыі, — праінфармаваў Мікалай Галабародзька — Хачу дадаць, што пры клінічным выкарыстанні вакцын таксама магчымыя пэўныя «сюрпрызы», накшталт калі трэцяя фаза і завяршылася са станоўчым вынікам. Вакцына пасля заканчэння выпрабоўванняў прызнаецца эфектыўнай, бяспечнай, выходзіць на рынак, і зрэдку здараюцца такія гісторыі, як, напрыклад, у Фінляндыі ў 2009—2010 гадах. Там у выніку імунізацыі насельніцтва пэўнай вакцынай ад пандэмічнага грыпу былі зафіксаваныя выпадкі наркалепсіі (частата 1 выпадак на 16—50 тысяч чалавек), якая характарызуецца складанымі расстройствамі сну і раптоўным засынаннем. Сталі шукаць прычыну, расшыфравалі патагенез наркалепсіі і высветлілася, што ў неўралагічным расстройстве вінаватая менавіта вакцына.

Асабіста я для сябе сфармуляваў наступныя галоўныя этычныя пытанні, якія паўстаюць у сувязі з удзелам Беларусі ў клінічных выпрабаваннях расійскай вакцыны. **Як будуць забяспечвацца правы беларускіх добраахвотнікаў? Наколькі нашы камітэты па біяэтыцы могуць абараніць інтарэсы пацыентаў? Ці адбылася катастрофа, якая прымушае нас хапацца за выратавальную саломінку?** Або, можа, трэба было ўсё ж такі пачакаць, належным чынам праверыць і пераканацца ў бяспецы і эфектыўнасці прэпарата, створанага ў Нацыянальным даследчым цэнтры эпідэміялогіі і мікрабіялогіі імя М. Ф. Гамалеі?

## СТРАХ І НАДЗЕЯ

— Мне гэта сітуацыя, калі шчыра, зусім не падабаецца. Мы не выступаем як паўнавартасны ўдзельнік даследавання ў якасці аднаго з распрацоўшчыкаў, на беларусах вакцыну проста тэсціруюць, — канстатуе **член Рэспубліканскага камітэта па біяэтыцы Андрэй ФАМЕНКА.** — Гэта нераўнапраўнае супрацоўніцтва. І ў мяне ёсць пытанні па двух фазах клінічных выпрабоўванняў расійскай вакцыны. А ці была там праведзена этычная экспертыза даследаванняў, бо галоўная функцыя экспертызы — зрабіць увесь працэс максімальна празрыстым...

Узнікае таксама пытанне, а чаму б беларусам не звязвацца больш актыўна з іншымі стваральнікамі вакцын, каб удзельнічаць і ў іх клінічных выпрабаваннях? Удзел у мультыцэнтравых клінічных даследаваннях з удзелам буйных фармацэўтычных вытворцаў павінен нас цікавіць пры ўмове, што ўсе працэдурныя фармальнасці будуць захаваныя. І этычная экспертыза абавязкова павінна папярэднічаць правядзенню такіх выпрабоўванняў — гэта падмурак даследчай этыкі. Сур'ёзныя кампаніі звычайна вельмі руплівa праводзяць падрыхтоўчы этап да выпрабоўванняў, каб цалкам абараніць сябе і сваю рэпутацыю: ён можа заняць і год, і два.

І мне не вельмі зразумелы інтарэс Беларусі. Няўжо мы не маглі пачакаць, пакуль у Расіі завершацца выпрабоўванні? Чым абумоўленая такая паспешлівасць, асабліва пры наяўнасці сумненняў у навуковым асяроддзі наконт таго, наколькі карэктна былі праведзеныя раней даследаванні? Ці мы жадаем атрымаць доступ да вакцыны ў ліку першых? Тады сэнс у гэтым ёсць...

— Насамрэч, беларусы вельмі актыўна цікавіліся магчымасцямі паўдзельнічаць у трэцяй фазе клінічных выпрабоўванняў вакцыны. І мне гэта нагадала, як у канцы 1990-х — пачатку 2000-х гадоў пацыенты імкнуліся быць уключаны ў клінічныя даследаванні проціракавых прэпаратаў, бо для іх тады гэта азначала магчымасць захаваць жыццё. У тыя часы на клінічныя выпрабоўванні выходзілі новыя супрацьпухлінныя прэпараты, — кажа Мікалай Галабародзька. — Зараз крыніцай страху для людзей стаў каранавірус, і тут раптам з'явілася надзея. Напэўна, задача даследчыка, які бярэ ў добраахвотніка інфармаваную згоду на ўдзел у выпрабоўваннях, вельмі дакладна разумець, а ці няма ў таго завышаных чаканняў? Ці насамрэч ён разумее, што ўдзел у даследаванні можа не толькі сфарміраваць ахову ад каранавірусу, але і прывесці да нейкага пабочнага эфекту? Або эфекту, які ён чакае, дасягнуць не атрымаецца. У процілеглым выпадку этычны цяжар будзе ляжаць на тых, хто прапанаваў удзел у даследаванні. Працытую адну фразу з амерыканскага дапаможніка для камітэтаў па біяэтыцы: «Навуковая супольнасць разлічвае на магчымасць даследчыка належным чынам атрымаць інфармаваную згоду».

— Важна, каб інфармаваная згода была насамрэч інфармаванай і добраахвотнасць не выклікала сумненняў, каб яна базавалася на праўдзівай, зразумелай і дасгупнай кожнаму інфармацыі, — падкрэслівае **старшы выкладчык кафедры грамадзянскага права БДУ Алена БАСАЛАЙ.** — Патрабуюцца выключна падрабязныя веды...

— Я ўпэўнены, што ўдзельнікі трэцяй фазы выпрабоўванняў разумеюць усе рызыкі, бо яны давалі інфармаваную згоду, — падзяліўся сваім меркаваннем **дацэнт кафедры дзіцячай хірургіі БДМУ, доктар медыцынскіх навук Юрый ДЗЕГЦЯРОЎ.** — У нашай краіне вакцыны не ствараюцца, а для практычнай сістэмы аховы здароўя актуальнае зараз толькі адно пытанне: калі вакцына ад каранавіруса стане даступная ўсім пацыентам? COVID-19 паскорыў многія працэсы, не толькі па стварэнні вакцыны, але і тэрміны праходжання навуковых публікацый. Амерыканцы, якія ствараюць свае вакцыны з захаваннем усіх працэдур, прагназуюць, што насельніцтва атрымае вакцыну ад каранавіруса толькі да 2022 года, і там ужо вызначыліся, каго будуць прышчапляць першымі: медыкаў і пажылых людзей. Зразумела, што ўсе будуць забяспечваць вакцынай у першую чаргу сваіх грамадзян, а астатнія краіны атрымаюць яе па рэштковым прынцыпе. Праўда, амерыканцы збіраюцца паклапаціцца яшчэ і пра сваіх бліжніх суседзяў — мексіканцаў, каб застрахаваць сябе ад пагрозы пранікнення інфекцыі. А паколькі мы сваёй вакцыны не маем, я лічу, што нам трэба пагаджацца на любыя ўмовы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Развітанне

# І будуць ісці дажджы...

**Не стала сярод нас, жывых, вялікага беларускага паэта, які сціпла і годна жыў і працаваў у Гродне, не стала мастацкага летапісца і творцы з планетарным мысленнем... 12 кастрычніка памёр Юрка ГОЛУБ.**



Светлы чалавек, з усмешкай на твары, якая, здавалася, прысутнічала ў яго заўсёды, ён быў здольны з вышыні свайго таленту аглядаць усе часы, быў здольны ахапіць усю Айчыну і яе клопаты. Калі сёння кажуць, што нашы дзесяцігоддзі — не час для паэзіі, то я веру, што вялікую, сапраўдную паэзію, шчырае яе ўспрыманне чытацкай грамадою вернуць якраз вершы Юркі Голуба і роўных, блізкіх яму паэтаў.

Неяк так склалася, што ў якасці мастацкага сімвала, архетыпу, вобраза паэт часта выкарыстоўваў дождж і ўсе словы, што яго характарызуюць. Першая кніга (выдадзеная ў 1969-м, калі паэту, пэўна, яшчэ не было і 22 гадоў) — «Гром на зялёнае поле». Другі зборнік — праз шэсць гадоў — «Дрэва навальніцы». А былі ж яшчэ: «Сын небасхілу», «Поруч з дажджом»...

**Гродзенскі літаратуразнавец, чалавек высокай мастацкай культуры, кандыдат філалагічных навук Аляксей ПЯТКЕВІЧ** так сказаў пра паэзію Юркі Голуба: «...вершам паэта ўласцівы вострае адчуванне драматызму сучаснасці, шчодрасць душэўнага самавыяўлення, валоданне сваім творчым голасам, непаўторнай манерай пісьма, якая вызначаецца лаканічнасцю, багатай асацыятыўнасцю, яркай метафарычнасцю, натуральнасцю рытміка-інтанацыйнага прамаўлення».

Родам Юрка Голуб з Гродзеншчыны, з вёскі Горна, што ў Зэльвенскім раёне. Паўвека яго жыцця прайшло ў Гародні, Гродне. Працаваў на тэлебачанні, у абласной газеце «Гродзенская праўда». Выдаў некалькі нумароў рэгіянальнага літаратурнага часопіса «Галасы».

У асобе Юркі Голуба прыкметная яшчэ і наступная акалічнасць — ён з тых мастакоў слова, чыя прысутнасць, творчая дзейнасць у тым ці іншым рэгіёне бачыцца знакавай, знамянальнай. Менавіта дзякуючы ў многім асобе Юркі Голуба Гродна лічыцца літаратурным цэнтрам, які поўніцца рознымі мастацкімі фарбамі.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
15 КАСТРЫЧНІКА 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 19 (15896)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Шоу «Кіданне нажоў»:

# «Прамахнуцца цяжэй, чым папасці»

**З самага дзяцінства ў свядомасці чалавека закладваецца думка, што гуляць з вострымі прадметамі небяспечна, бо можна парэзацца. Аднак гэта не аргумент для нашага суразмоўніка. Андрэй ГОМАНАЎ не толькі сам «забаўляецца» з такімі прадметамі, але і кідае іх у жывую мішэнь — чароўную асістэнтку Дар'ю ШАРАМЕТ. Мы пагаварылі з адзіным прафесійным дуэтам у Беларусі ў шоу «Кіданне нажоў» і высветлілі ўсе тонкасці іх работы.**



— Гэтым заняткам я захапіўся яшчэ ў дзяцінстве, — расказвае Андрэй. — Спачатку ў мяне быў звычайны кішэнны сцізорык, і я кідаў яго ў розныя дрэвы. Але потым на пэўны адрэзак часу адмовіўся ад свайго захаплення, атрымаў юрыдычную адукацыю, стаў працаваць па заклiку сэрца танцорам. Падчас сваёй танцавальнай кар'еры адчуваў, што мне чагосьці не хапае, і вырашыў сваё дзіцячае хобі зрабіць прафесійным заняткам. Пайшоў у клуб «Шалёны зубр» і пад пільным кіраўніцтвам свайго трэнера Алега Паўлавіча Мартынчука хутка асвоіўся і літаральна праз пару месяцаў прыняў удзел у чэмпіянаце Беларусі, пачаў займаць прызавыя месцы.

Але ўсё адно: пачуццё незадаволенасці захоўвалася, як быццам чагосьці не хапала ў жыцці нашага героя. Тады ён вырашыў сумясціць сваю прафесію паводле адукацыі з любімым заняткам і стаў арганізоўваць шоу «Танец на лязе нажа», дзе спалучае творчасць з прафесійным кіданнем вострых прадметаў па розных мішэнях.

— Спачатку трэніраваўся толькі з неадушаўлёнымі прадметамі, але потым зразумеў, што гатовы перайсці да «жывой» мішэні. Першым такім асістэнтам быў мой дзядзька Пётр Мяхедзька, які бясстрашна пагадзіўся паўдзельнічаць у рэпетыцыі трукаў. Але я падумаў, што для выступленняў на сцэне ён не зусім падыходзіць. *(Смяецца.)* Тады размясціў аб'яву ў інтэрнэце аб пошуку напарніцы.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Новы падыход

# Да чаго рыхтавацца абітурыентам 2022 года?

## У ВНУ могуць вярнуцца экзамены

**У пачатку верасня Міністэрства адукацыі распачало грамадскае абмеркаванне змянення фармату ўступнай кампаніі ва ўстановы вышэйшай адукацыі ў 2022 годзе. Для беларускіх школьнікаў, якія прызвычаіліся здаваць выпускныя экзамены ў школе, а ўступныя — на ЦТ, гэта стала громам сярод яснага неба.**

Новы парадак, у прыватнасці, прадугледжвае замест выпускных экзаменаў правядзенне нацыянальнага экзамена па двух прадметах, сумешчанага з цэнтралізаваным тэсціраваннем (ЦТ). Мяркуецца, што выпускнік школы будзе здаваць нацыянальны экзамен па беларускай ці рускай мовах і яшчэ адзін прадмет на выбар (матэматыку, фізіку, замежную мову і іншыя), які з'яўляецца другім профільным для спецыяльнасці, куды плануецца паступленне.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Сёмае неба

# АДНО «КРЫЛО» НА ДВАІХ,

## або Як гэта — лунаць над аблокамі



Каманда падчас трэніровак.

**Родныя брат і сястра з аграгарадка Брашэвічы Драгічынскага раёна Расціслаў і Крысціна КРАЎЧУКІ не ўяўляюць свайго жыцця без неба, — яны захопленыя парашутным спортам. Спачатку ў Брэсцкі аэраклуб ДТСААФ пяць гадоў таму прыйшоў хлопец, а праз некаторы час прывёў туды і сястру. Зараз героі жывуць у Брэсце і кожныя выхадныя прыязджаюць на аэрадром, каб заняцца любімай справай.**

— Заўсёды быў актыўным хлопцам. Займаўся пешаходным турызмам, скалалажаннем. У пэўны момант захацелася рэалізавацца ў нечым іншым, — падзяліўся Расціслаў. — Падчас вучобы ва ўніверсітэце пачуў ад сябра, што ёсць такая арганізацыя, дзе можна паспрабаваць сябе ў парашутным спорце.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
15 10 2020 г.

# Да чаго рыхтавацца абітурыентам 2022 года?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Пасля заканчэння школы ён атрымае на рукі сертыфікаты ЦТ (набраныя на цэнтралізаваным тэсціраванні балы па гэтых прадметах будуць улічвацца пры выстаўленні адзнак у атэстат) і атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі з падлічаным у ім сярэднім балам.

Абітурыенты, якія скончылі школу ў бягучым годзе, па жаданні змогуць здаць дадаткова ЦТ па адным профільным прадмеце (матэматыку, фізіку, замежную мову і іншыя) для пашырэння магчымасці выбару спецыяльнасцяў пры паступленні.

Абітурыенты, якія скончылі школу ў папярэднія гады, здаюць ЦТ па рускай/беларускай мове (па выбары) і ў абавязковым парадку па другім профільным прадмеце для спецыяльнасці, на якую плануецца паступленне. Таксама яны могуць здаць ЦТ дадаткова па любым прадмеце для пашырэння магчымасці выбару спецыяльнасцяў для паступлення.

Але ўсе абітурыенты, як прапануецца, будуць здаваць унутраны экзамен у ВНУ па першым профільным прадмеце па ўсіх спецыяльнасцях. Што такое ўнутраныя экзамены і кантакты з экзаменатарамі сам-насам, з цяжкасцю прыгадаюць нават бацькі цяперашніх школьнікаў. А калі і здолеюць, то наўрад ці гэтыя ўспаміны будуць звязаны ў многіх з іх са станоўчымі эмоцыямі.

## Высокія балы пры сціплых ведах

Доўгі час адной з галоўных пераваг правядзення ў нашай краіне ўступнай кампаніі ў форме цэнтралізаванага тэсціравання лічылася яе празрыстасць, абарона ад карупцыйных праяў і стварэнне роўных умоў для паступлення для ўсіх: і для выпускнікоў прэстыжных гарадскіх ліцэяў і гімназій, і для выхаванцаў звычайных малакамплектных сельскіх школ.

У цэнтралізаванага тэсціравання ў Беларусі ёсць свая адметнасць — у нашай краіне яно выкарыстоўваецца выключна для адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет. І да нядаўняга часу ЦТ пазіцыянавалася менавіта як абітурыенцкае, мэта якога — ацаніць адрозненні ва ўзроўні падрыхтоўкі абітурыентаў, параўнаць індывідуальныя вынікі з вынікамі іншых удзельнікаў і вызначыць адносную пазіцыю ў групе тых, хто трымае іспыт. Вынікі такіх экзаменаў дазвалялі вызначыць рэйтынг кожнага абітурыента сярод прэтэндэнтаў на студэнцкі білет у адпаведнасці з узроўнем яго падрыхтоўкі.

Але з 2019 года адмовіліся ад рэйтынгавай шкалы: была ўведзена новая методыка падліку балаў на ЦТ, пры гэтым нічога прынцыпова ў змесце тэстаў не змянілася. Па-ранейшаму ў іх пераважаюць заданні з варыянтамі адказаў, а таму некаторыя абітурыенты проста працягваюць угадваць правільны. Аднак **калі раней нельга было метадам выпадковага выбару адказаў набраць мінімальны прахадны бал, то цяпер гэта стала магчыма, і мінімальны парог аказаўся пустой фармальнасцю.**

Калі раней з усіх бакоў галасілі, абапіраючыся на балы ЦТ, што ўзровень падрыхтоўкі выпускнікоў знізіўся ўжо да крытычнай адзнакі, то цяпер абітурыенты і педагогі не разумеюць, адкуль бяруцца высокія балы пры вельмі сціплых ведах, і чаму для тых, хто прэтэндуе на максімум, любая памылка каштуе вельмі дорага.

— Ёсць думка, што новая методыка недаацэньвае добра падрыхтаваных абітурыентаў. Лічу, што такое меркаванне некарэктнае, — адказваў на папрокі **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК.** — Раней чым больш абітурыентаў ведалі нейкі раздзел вучэбнай праграмы і, адпаведна, рашалі задачу з яго, тым меншы ўклад у агульны тэставы бал уносіла такая задача, а каштоўнасць заданняў, з якімі спраўляліся ўсе, набліжалася да нуля, і фактычна гэтыя веды не ацэньваліся і не ўлічваліся. Цяпер кожнаму заданню прысвоўваецца першасны бал, які вядомы загадзя. Той, хто атрымлівае больш першасных балаў, мае і больш тэставых.

Стваральнікі новай сістэмы падліку балаў вырашалі адначасова дзве праблемы. Першая — укараненне методыкі, якая давала б ацэнку ведаў у абсалютнай велічыні, гэта значыць, стала б больш аб'ектыўнай. Ранейшая рэйтынгавая методыка не дазваляла супаставіць узровень ведаў, прадэманстраваных абітурыентам на ЦТ, з яго школьнымі ведамі. А новая методыка, на іх думку, дазваляе зняць псіхалагічны бар'ер, які ўзнікаў у абітурыентаў пасля атрымання нізкіх балаў. Раней 20—30 балаў, атрыманых на ЦТ, былі рэйтынгавай ацэнкай за выкананне тэста і не адлюстроўвалі рэальны ўзровень ведаў абітурыента.

Цяпер ніхто не можа атрымаць менш за першасны бал. Методыка скіраваная на тое, каб ацаніць паўнату ведаў: чым больш заданняў выконвае абітурыент, тым больш балаў ён набірае.

— Трэба адзначыць, што шкала падліку балаў не з'яўляецца лінейнай, — тлумачыць Юрый Міксюк. — Можна трактаваць гэта з пункту гледжання спорту: апошнія метры перад фінішам самыя каштоўныя.

Крытыку наконт магчымасці ўгадвання правільных адказаў арганізатары ЦТ лічаць не зусім аб'ектыўнай, хоць і пагаджаюцца, што такая імавернасць усё яшчэ захоўваецца.

— Мы праводзім пэўную работу, каб зменшыць такую магчымасць, — казаў журналістам Юрый Міксюк. — Так, у частцы А, дзе прапануюцца заданні закрытага тыпу з варыянтамі адказаў, павялічылі колькасць дыстрактараў з чатырох да пяці па шэрагу прадметаў. Але адмовіцца цалкам ад закрытых заданняў мы не можам: яны выкарыстоўваюцца ў многіх краінах свету і даюць магчымасць за кароткі час праверыць веды абітурыента па шырокім коле пытанняў і тэм. Але набраць вялікую колькасць балаў за такія заданні немагчыма.

## Тэсты і функцыянальная адукаванасць

Трэба заўважыць, што пасля распаду Савецкага Саюза ўсе яго колішнія рэспублікі пачалі ўкараняць незалежныя працэдуры экзаменаў. Прычынай сталі непразрыстая сістэма ўступных іспытаў у ВНУ, суб'ектыўнасць пры правядзенні выпускных экзаменаў у школе і ўступных у ВНУ, карупцыя і «шэрыя схемы» для паступлення... Усе былі нацэлены на аб'ектыўную сертыфікацыю дасягненняў. Праўда, для таго каб забяспечыць інфармацыйную бяспеку, кожная краіна распрацоўвае свае падыходы і прымяняе свае арганізацыйна-тэхналагічныя прыёмы пры правядзенні нацыянальных экзаменаў.

У Расіі з 2009 года асноўнай формай выніковай атэстацыі выпускнікоў школ і ўступных іспытаў у ВНУ з'яўляецца Адзіны дзяржаўны экзамен (АДЭ). Для расійскіх выпускнікоў АДЭ па рускай мове і матэматыцы — абавязковы, астатнія прадметы здаюцца па жаданні ў неабмежаванай колькасці.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

На выхадзе са школы матэматыку на АДЭ можна здаваць на базавым і профільным узроўнях. Калі абітурыент збіраецца паступаць на спецыяльнасць, дзе матэматыка — галоўны прадмет, ён павінен асіліць профільны тэст.

Адзіны дзяржаўны экзамен, як і ЦТ, складаецца з дзвюх частак. Першая змяшчае заданні закрытага тыпу, дзе трэба ўказаць лічбу ці запісаць кароткі адказ (заданняў з выбарам адказу няма). А ў другой частцы трэба даць разгорнуты адказ. Па рускай мове і літаратуры пішацца сачыненне. У тэстах па матэматыцы, інфарматыцы, хіміі, біялогіі, геаграфіі і фізіцы распісваецца рашэнне задач. У АДЭ па гісторыі і грамадазнаўстве абітурыенты падрабязна адказваюць на пытанні. Другая частка ў тэстах па замежных мовах — гэта праверка маўлення. Здаецца па жаданні. Падчас адказу вядзецца аўдыя- і відэазапіс.

Увесь працэс здачы іспыту — ад моманту прыходу дзяцей у аўдыторыю да іх выхаду — фіксуюць камеры, якія дазваляюць адсочваць усе магчымыя парушэнні.

Заданні з разгорнутым адказам правяраюць двое экспертаў: калі іх ацэнка задання не сыходзіцца, то яны ставяць бал на карысць удзельніка экзамена. Калі разыходжанне ў ацэнцы сур'ёзнае, то работу правярае трэці эксперт.

На тэсціраванне робяць стаўку Літва, Украіна, Малдова, Арменія, Казахстан, Кыргызстан, Азербайджан, Таджыкістан.

У Арменіі навучэнцы пасля заканчэння школы для паступлення ў ВНУ здаюць тэсты накшталт Адзінага дзяржаўнага экзамена ў Расіі. Прадметы маюць два ўзроўні — А і Б. Калі для паступлення не патрэбна пэўная вучэбная дысцыпліна, прайсці школьнае выпрабаванне па ёй дазваляецца на ўзроўні А. Але калі яна неабходная, прыйдзецца адолець абодва ўзроўні. У большасці выпадкаў выпускнікі здаюць тры іспыты, часам — два. Абітурыенты філфака, напрыклад, пераадольваюць два адзіныя дзяржаўныя экзамены, а ўжо ва ўніверсітэце вусна правяраюць іх веды па літаратуры.

У тэстах выкарыстоўваюцца толькі тэхналагічныя заданні, якія правяраюцца сканіраваннем бланкаў адказаў: заданні на выбар з чатырох прыведзеных варыянтаў, заданні з кароткім адназначным адказам (лічбай) і так званы букет сцвярджэнняў (з іх трэба выбраць адзін з варыянтаў «дакладна», «няправільна», «не ведаю»).

Нягледзячы на тое, што частка А тэстаў эквівалентная тэсту выпускных экзаменаў, гэта значыць, абслугоўвае сертыфікацыйныя мэты сярэдняй школы, увесь тэст (узроўні А+Б ) скіраваны на селекцыю і прызначаны ў першую чаргу для правядзення адбору ў ВНУ. Таму для часткі Б выбіраюцца заданні з большай здольнасцю да ранжыравання. Экзамен доўжыцца 2,5-3 гадзіны ў залежнасці ад прадмета.

У Казахстане да 2016 года вынікі Адзінага нацыянальнага тэсціравання (АНТ) выкарыстоўваліся для выніковай атэстацыі ў сярэдніх школах, але з 2017 года сталі прымяняцца толькі для паступлення ў ВНУ. Да 2016 года ў рамках Адзінага нацыянальнага тэсціравання ацэньваліся толькі прадметныя веды абітурыентаў. Але ў 2017 годзе адбылося некалькі важных зменаў — адначасова з прадметнымі ведамі сталі ацэньвацца матэматычная адукаванасць і разуменне тэкстаў. Уключэнне ў змест тэстаў заданняў на праверку функцыянальнай адукаванасці было звязана з агульнай палітыкай мадэрнізацыі школы.

## А што ў вас... з вербальным мысленнем?

А як адбіраюць моладзь для навучання ў ВНУ ў далёкім замежжы?

У Японіі для паступлення ў ВНУ выпускнік павінен прайсці два туры выпрабаванняў. Першы — (University Entrance Center Examination, UECE) — цэнтралізаваны, здаецца амаль за паўгода да паступлення. Гэтыя экзамены абавязковыя ва ўсе дзяржаўныя ВНУ. Яны ўяўляюць сабой тэсціраванне і праводзяцца па 12 прадметах. Колькасць экзаменаў вызначаецца патрабаваннямі абранай ВНУ. Другі тур экзаменаў праводзіцца ўніверсітэтамі. Яны больш складаныя за нацыянальныя і распрацоўваюцца спецыялістамі вышэйшай навучальнай установы.

Для паступлення ў ВНУ Ізраіля вучні здаюць псіхаметрычны экзамен, вынікі якога лічацца сапраўднымі яшчэ сем гадоў! Прымаць у ім удзел можна колькі заўгодна разоў, але паміж спробамі яго здаць павінна прайсці не менш за паўгода. Экзамен уяўляе сабой тэсты па трох кірунках: вербальнае мысленне, колькаснае мысленне (ацэньваюцца матэматычныя здольнасці) і англійская мова

Адна з самых складаных сістэм адбору выпускнікоў школ у каледжы і ўніверсітэты — у ЗША. Там няма адзіных праграм навучання і нацыянальных экзаменаў, а вымяральнікам зместу адукацыі выпускнікоў старшай сярэдняй школы з'яўляецца колькасць вывучаных курсаў, арыентаваных на падрыхтоўку ва ўніверсітэт. Самыя вядомыя і распаўсюджаныя іспыты ў ЗША, якія могуць улічвацца пры паступленні ў ВНУ, — гэта тэсты SAT (Scholastic Achievement Test) і ACT (American College Testing). У іх уваходзяць заданні з некалькіх абласцей ведаў.

У большасці краін на іспытах прымяняюцца розныя формы праверкі ведаў: заданні з выбарам адказу, з кароткім адказам (запаўненнем формы) і з разгорнутым адказам. У еўрапейскіх краінах пераважна выкарыстоўваюцца апошнія дзве формы. Толькі ў ЗША заданні з выбарам адказу складаюць больш за палову экзаменацыйнай работы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Заўвагі і прапановы наконт змянення правілаў паступлення ў ВНУ можна адпраўляць на электронны адрас infominedu@unibel.by з пазнакай «змяненне фармату ўступнай кампаніі», а таксама пры дапамозе спецыяльна створанага бота ў Telegram.

Але адказаў на заўвагі і прапановы не будзе, папярэджваюць у Міністэрстве адукацыі. Яны будуць разгледжаны міжведамаснай рабочай групай па распрацоўцы новай рэдакцыі правілаў прыёму ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Вектар руху

# ПАСЫЛ І ПРАПАНОВЫ АД КРЭАТЫЎНЫХ

**На Гомельшчыне маладзёжны форум аб'яднаў у моцную творчую каманду больш за тры з паловай тысячы хлопцаў і дзяўчат з розных куткоў рэгіёна і гасцей вобласці.**



Форум разгарнуўся на тэрыторыі абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па лёгкай атлетыцы і на базе Цэнтра інклюзіўнай культуры. Тут, дарэчы, удзельнікаў чакала адно з цэнтральных мерапрыемстваў — адкрыты дыялог «Беларусь — гэта МЫ!» Ён прайшоў у нестандартным фармаце бліц-меркаванняў. На пляцоўцы свае ідэі, прапановы, заўвагі маглі агучыць лідары маладзёжнага руху, прадстаўнікі вертыкалі ўлады, дэпутаты. Удзельнікі абменьваліся ідэямі і вялі перакрыжаванае апытанне.

Напрыклад, востра абмяркоўвалася тэма так званай інфармацыйнай вайны ў інтэрнэт-прасторы. Удзельнікі пляцоўкі гаварылі пра неабходнасць стварэння медыя-холдынга, які будзе адлюстроўваць сітуацыю па розных кірунках. Як прыклад удалага фармату быў названы Telegram-канал «Пул Першага».

Падчас адкрытага дыялогу згадалі і плённы вопыт работы маладзёжнай пляцоўкі «Рух НАПЕРАД». Яна акумулюе ініцыятывы і праекты актыўных прадстаўнікоў маладога пакалення. На цяперашні момант вылучана мноства прапаноў, якія актыўна адпрацоўваюцца, адзначыў старшыня маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь Ягор МАКАРЭВІЧ.

— Некаторыя прапановы скіраваны на доўгатэрміновую перспектыву. Напрыклад, яны датычацца ўнясення змяненняў у Канстытуцыю. Ёсць і больш лакальныя ініцыятывы: паляпшэнне гарадскіх інфраструктур ці змена адукацыйных праграм. Мы разглядаем іх усе, каб затым перадаць у профільныя ведамствы, заканадаўцам, магчыма, прапанаваць да разгляду на будучым Усебеларускім народным сходзе, — адзначыў лідар маладзёжнага парламента. Ён падкрэсліў, што моладзь гатовая не проста ўключацца ў дыялог, але і сачыць за рэалізацыяй сваіх ініцыятыў.

Намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй БАРАНОЎСКІ ўпэўнены: у Беларусі заўсёды ўмелі слухаць і чуць галасы маладых.

— У нас выдатная, актыўная, крэатыўная моладзь. І менавіта ад яе павінен ісці пасыл і прапановы для органаў улады. Нам важна, якім маладыя бачаць развіццё краіны ў будучыні, — сказаў ён.

Між тым у кожным горадзе рэгіёна павінны існаваць цэнтры прыцягнення актыўнай мэтанакіраванай моладзі. Такую думку выказаў член Савета Рэспублікі, першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Дзмітрый ВАРАНЮК.

— Як адзначае Прэзідэнт, у моладзі і грамадскіх арганізацый павінны быць не толькі прапановы, але і пэўныя справы. На форумах мы абмяркоўваем ініцыятывы, што паступаюць, і ў далейшым будзем думаць, як іх ажыццявіць, — падкрэсліў Дзмітрый Варанюк. — Адна з прапаноў — ствараць крэатыўныя прасторы для моладзі. Тут можна, напрыклад, арганізоўваць семінары, чытаць кнігі, гуляць у настольныя гульні. І такія цэнтры маладзёжнага прыцягнення павінны быць у кожным раёне, кожным невялікім горадзе, — падзяліўся Дзмітрый Варанюк.

У фармаце відэазвароту ўдзельнікаў форуму вітаў старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ. Губернатар звярнуў увагу на тое, што сёння важна захаваць незалежнасць і цэласнасць дзяржавы. Ён заклікаў не паддавацца на правакацыі, бо ўсе супярэчнасці можна вырашаць толькі ў канструктыўным дыялогу.

Насычаная праграма форуму прапанавала ўдзельнікам шматлікія інтэрактыўныя пляцоўкі і прэзентацыі. Госці змаглі акунуцца ў атмасферу працоўных будняў студатрадаў. Актывісты расказалі аб профілях студэнцкага руху.

Аматарам сучаснага мастацтва прапанавалі міні-курс па бодзі-арце і пляценні кос. Паралельна праходзіла выстаўка маладзёжных фотапраектаў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

Пасябраваць з музай

# Кранула лістом да дзядулі

**Пераможцам Міжнароднага маладзёжнага конкурсу сачыненняў эпісталярнага жанру стала юная беларуска.**



Творчае спаборніцтва арганізуе Сусветны паштовы саюз з мэтай развіцця ў маладых людзей здольнасці фармуляваць і выказваць свае думкі, абуджаць жаданне пісаць лісты, садзейнічаць умацаванню міжнародных сяброўскіх сувязяў. Удзельнічаюць у ім дзеці і падлеткі ва ўзросце да 15 гадоў.

У 2020 годзе пераможцам конкурсу стала прадстаўніца Беларусі Вольга Ваўчкевіч, 11-гадовая школьніца з Гродна. Яе твор быў самы яркі і кранальны. Перш чым дамагчыся такога поспеху, школьніца прайшла сур'ёзны шлях: спачатку перамагла ў школьным конкурсе, затым у гарадскім, абласным, рэспубліканскім і, нарэшце, у міжнародным этапе.

Удзельнікам было прапанавана напісаць ліст дарасламу пра свет, у якім мы жывём. З усіх куткоў Беларусі на конкурс было прадстаўлена амаль паўтары тысячы твораў. Найлепшай прызнаная работа Вольгі, якая і прадставіла нашу краіну на міжнародным узроўні ў Швейцарыі, дзе заваявала залаты медаль. Вольга свой ліст пісала для дзядулі, якога ўжо няма, і гэта, верагодна, наклала нейкі адбітак суму і далікатных успамінаў на эпісталярнае пасланне. У яе лісце ўсе прачыталі: «Ах, дзядуля! Выходзіць, наш свет не такі ўжо дрэнны! Ён складаны, але які ж ён цудоўны ў сваёй разнастайнасці! І калі глядзець на свет закаханымі вачыма неабыякавага чалавека, лёгка зразумець, які ён выдатны!!!»

За час правядзення міжнароднага конкурсу нашы маладыя аўтары заваявалі на ім адзін залаты медаль у 2003 годзе, два сярэбраныя — у 2008 і 2010 гадах і адну «бронзу» — у 2009 годзе. Дарэчы, другое месца сёлета ў прадстаўніка Паўночнай Македоніі, а трэцяе — В'етнама.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота з сайта blog.belpost.by.**

***Паслухаць, як гучыць пісьмо дзяўчынкі ў яе ўласным выкананні, можна на нашым сайце zviazda.by.***

У ліку найлепшых

# Ліцэісты МНС — пераможцы кадэцкай змены

**Пераможцамі кадэцкай змены Саюзнай дзяржавы «За гонар Айчыны», якая праходзіла ў «Зубраняці», сталі навучэнцы Спецыялізаванага ліцэя пры Універсітэце грамадзянскай абароны МНС. Вынікі падвялі падчас яе закрыцця, паведамляе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.**



Сёлета ў міжнароднай змене прынялі ўдзел больш за тры сотні падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў з Беларусі і Расіі. Прадстаўнікі Расійскай Федэрацыі ўдзельнічалі ў конкурснай праграме ў анлайн-рэжыме і прадстаўлялі Удмурцкую і Чувашскую рэспублікі, Белгародскую, Бранскую, Уладзімірскую, Варонежскую, Курскую, Маскоўскую і Пензенскую вобласці. З боку Беларусі былі навучэнцы з ліцэяў МНС і МУС, а таксама кадэты, якія прадстаўлялі свае вучэльні з Гродна, Брэста, Магілёва і Мінска.

Удзельнікам трэба было паказаць майстэрства ў аглядзе-конкурсе строю і песні, ваенна-спартыўнай гульні «Ураган» і конкурсе прэзентацый дэлегацый. Акрамя таго, яны інсцэніравалі ваенна-патрыятычныя песні і паўдзельнічалі ў ваенна-спартыўных спаборніцтвах, а таксама ў інтэлектуальным конкурсе знаўцаў ваеннай гісторыі. Прынялі ўдзел у спартыўных спаборніцтвах па плаванні, футболе, валейболе і баскетболе. Па выніках усіх спаборніцтваў ліцэісты МНС сталі пераможцамі XIV грамадзянска-патрыятычнай кадэцкай змены навучэнцаў Саюзнай дзяржавы «За гонар Айчыны», заваяваўшы пяць залатых, а таксама па тры сярэбраныя і бронзавыя медалі.

Упершыню грамадзянска-патрыятычная кадэцкая змена навучэнцаў Саюзнай дзяржавы была паспяхова рэалізавана ў «Зубраняці» ў верасні 2007 года і з таго часу праводзіцца штогод. За ўвесь час у ёй прынялі ўдзел больш за шэсць тысяч юных грамадзян Беларусі і Расіі.

Каманда Ліцэя МНС упершыню прыняла ўдзел у змене ў 2010 годзе. У 2013—2015 гадах ліцэісты займалі трэцяе месца, у 2016 годзе сталі другімі, а па выніках кадэцкай змены 2017—2020 гадоў каманда Ліцэя МНС займае выключна першыя месцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота з сайта МНС.**

З прыцэлам на будучыню

# ПАСПРАБАВАЦЬ ЖЫЦЦЁ Ў КАМПУСЕ НА СМАК

**У БДУ стартуе новы сезон праекта «Студэнт на тыдзень». У гэтым годзе прыём заявак на ўдзел абвясцілі 18 факультэтаў і адукацыйных інстытутаў. Мэтай акцыі з'яўляецца папулярызацыя адукацыйнай дзейнасці БДУ і аказанне садзейнічання абітурыентам пры выбары будучай прафесіі.**

Старшакласнікаў чакаюць у госці з 2 да 6 лістапада на факультэтах: біялагічным, геаграфіі і геаінфарматыкі, юрыдычным, гістарычным, механіка-матэматычным, філалагічным, фізічным, хімічным, эканамічным, журналістыкі, міжнародных адносін, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, сацыякультурных камунікацый, філасофіі і сацыяльных навук, а таксама ў Інстытуце тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла, Інстытуце бізнесу і Міжнародным дзяржаўным экалагічным інстытуце імя А. Д. Сахарава.

Старшакласнікі змогуць адчуць сябе сапраўднымі студэнтамі ВНУ. На працягу шасці дзён яны будуць наведваць навучальныя заняткі на розных курсах і спецыяльнасцях. Таксама гасцей пазнаёмяць з пазанавучальнай дзейнасцю факультэтаў і студэнцкім жыццём.

Праект «Студэнт на тыдзень» праводзіцца ў БДУ з кастрычніка 2016 года падчас веснавых і восеньскіх школьных канікул. Стартавай пляцоўкай стаў факультэт журналістыкі БДУ. За чатыры гады ўдзел у акцыі прынялі больш за 500 старшакласнікаў з усёй краіны, амаль 50 працэнтаў з якіх цяпер з'яўляюцца студэнтамі Белдзяржуніверсітэта. Праект не мае аналагаў ні ў адным беларускім універсітэце па маштабе і колькасці ахопленых абітурыентаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# АДНО «КРЫЛО» НА ДВАІХ...



Дзяўчына штораз адпрацоўвае элементы з інструктарам.

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Штогод перад пачаткам сезона там набіраюць ахвотных ва ўзросце 15—19 гадоў для падрыхтоўкі. Гэта бюджэтная праграма, якая дазваляе навучацца і скакаць бясплатна. Аднак на той момант набор у такую групу быў скончаны, прыйшлося пачакаць яшчэ год. Такім чынам у аэраклуб быў залічаны толькі ў 18 гадоў. Навучанне доўжылася тры месяцы, пасля чаго па праграме трэба было зрабіць тры кантрольныя скачкі, па якіх інструктар вызначае, ці варта табе заставацца ў гэтым спорце. Памятаю, у нашай групе спачатку было каля 40 чалавек, але пасля адбору застаўся толькі я.

Першая вышыня, якую ў адзіночку скараюць пачаткоўцы-парашутысты, — 800 метраў. Паступова яна расце, і разам з тым спартсмену становіцца цяжэй кіраваць сваім целам падчас палёту. Зыходзячы з таго, якія вынікі — як ідзе аддзяленне ад самалёта, ці стабільна адбываецца падзенне, — інструктар вырашае, ці рабіць «перасадку» на іншы тып парашута. Спачатку спартсмены выконваюць скачкі з «Юніёрам», потым з «Д1-5У», далей пераходзяць на «П1-У», а пасля — на спартыўнае «Крыло». У апошняга іншыя характарыстыкі: ён нашмат хутчэй лётае і вертыкальна, і гарызантальна, хутчэй раскрываецца, дазваляе рабіць розныя цікавыя элементы. Дарэчы, Расціслаў «перасеў» на яго яшчэ тры гады таму.

— Хуткасць вольнага падзення — 180-200 кіламетраў у гадзіну. Выконваю скачкі як у адзіночку, так і з напарнікам. На сёння іх ужо больш за 400. Самы запамінальны — з вышыні 3500 метраў. Адчуванні, якія атрымліваеш падчас палёту, немагчыма перадаць словамі. Быццам лунаеш над аблокамі. Тады скачок доўжыўся амаль хвіліну, у той час як звычайна — не больш за 20 секунд. У палёце думаю ў першую чаргу пра бяспеку, бо трэба заўсёды кантраляваць вышыню. Цікава, што толькі пасля таго, як на рахунку з'явіліся першыя 200 скачкоў, страх вышыні або нечага іншага стаў праходзіць, зараз увогуле ніякага хваляванне. Баяцца — нармальна, але не трэба гэтаму пачуццю дазваляць адольваць вас.

Акрамя Брэста, Расціслаў скакаў з парашутам на спаборніцтвах і паказальных выступленнях у Маларыце, Жабінцы, Кобрыне, Каменцы, Рагачове, Бабруйску, Віцебску. У дзень больш вопытным спартсменам можна скакаць з парашутам да пяці-шасці разоў. Аднак калі гэта робіць пачатковец — не больш за адзін.

— Шчыра кажучы, ні разу не бачыў тых, каму скачкі з парашутам не спадабаліся. Калі вы ўжо рашыліся на гэта, ні пра што не думайце, проста дзейнічайце. Мы з сястрой аб сваіх першых скачках бацькам нават не расказвалі. Ім было незразумела, навошта нам такое не вельмі бяспечнае хобі. У нас ёсць і малодшая сястра Маша, нядаўна мы з Крысцінай зрабілі ёй падарунак на дзень нараджэння — яна ўпершыню скокнула з парашутам у тандэме з інструктарам. Гэта быў сюрпрыз, ён ёй вельмі спадабаўся. Увогуле парашутны спорт — гэта заўсёды прыліў пазітыўных эмоцый. Калі выконваем новыя элементы з іншымі спартсменамі, радуемся, як дзеці. Да таго ж у аэраклубе знаходзіш блізкіх па духу людзей, таму наш калектыў — як адна вялікая сям'я. Не задумваюся пра тое, каб кідаць гэтую справу. Становіцца не па сабе, калі з-за пэўных абставін даводзіцца прапусціць скачкі з парашутам. Мой самы доўгі перапынак — паўгода. Было вельмі цяжка, хацелася хутчэй на вышыню.

Дваццацігадовая Крысціна пачала займацца парашутным спортам тры гады таму. Таксама, як і брат, падчас вучобы ва ўніверсітэце (зараз сураздоўніца — настаўніца пачатковых класаў).

— Ён прапанаваў скокнуць у тандэме з інструктарам, я пагадзілася. Мая першая скораная вышыня — 2750 метраў. Адчуванні на ёй былі неверагодныя. Нядзіўна, што ўсе, хто ходзіць у аэраклуб, скакаць хочуць многа і часта. Калі стаіць добрае надвор'е і ёсць паліва для самалёта, — ты ляціш, прызямляешся, хуценька бяжыш укладваць парашут, каб паспець да чарговага ўзлёту. На сёння ў мяне больш за 120 скачкоў, звычайна раблю іх з вышыні 1200—1400 метраў. Можна ўзяць і больш высокую, каб добра адчуць паток паветра, расслабіцца. Самая вялікая вышыня адзіночнага скачка — 1700 метраў. Як зараз памятаю: уверсе сонейка, аблокі як вата, і ты ў іх быццам правальваешся...

Кожны скачок індывідуальны, абавязкова нечым адрозніваецца ад іншых, кажа суразмоўніца. Самы незабыўны, які прынёс шмат адрэналіну, адбыўся ў Крысціны, калі яна пераходзіла на спартыўны парашут «Крыло».

— Там, на вышыні, вельмі трэсліся ногі, а калі прызямлялася — уся калацілася ад шчасця, дрыжаў голас. А на зямлі каманда крычала «Ура! Перасадка!» Тады скакала не ў адзіночку, а з партнёрам, — такая група з двух або трох чалавек называецца фармацыяй. З ёй можна выконваць розныя камбінацыі элементаў: набліжацца і аддаляцца адзін ад аднаго, трымацца за рукі, потым адначасова адкрываць парашуты і адразу ўзнімацца вышэй. Адчуванні неверагодныя, бо трэба авалодаць не толькі сваім целам, але і адчуваць напарніка, быць у тандэме, да таго ж, «увайсці» ў паток ветру, давярыцца яму, што часам бывае нялёгка.

Крысціна прызнаецца, што хваляванне падчас скачкоў прысутнічае заўсёды, іншым разам нават у майстроў спорту, бо ўсё ж такі спорт — экстрэмальны.

— Я яшчэ той панікёр! Але нават калі ўзнікнуць праблемы з раскрыццём асноўнага парашута на вышыні, дзякуй Богу, ёсць запасны, які мне яшчэ не даводзілася выкарыстоўваць. За дзень да скачкоў у парашутыстаў ёсць абавязковая папярэдняя падрыхтоўка: мы праходзім «адчэпку» (пэўны набор дзеянняў пры экстрэмальнай сітуацыі, якая можа здарыцца ў небе), займаемся ўкладкай парашутаў. Бо ў першую чаргу наш спорт — гэта пра бяспеку, а ўжо потым пра якасць і колькасць скачкоў. Напрыклад, яшчэ на зямлі прагаворваем і прапрацоўваем, як будзем дзейнічаць, калі з ранца не выйшаў купал парашута. Увогуле, прызямліцца каля канавы або лесу — звычайная сітуацыя. Здаралася і закрутка стропаў парашута, але гэта не страшна. Дарэчы, розныя чэмпіянаты і абласныя спаборніцтвы праходзяць даволі часта, і ўсе яны для нас, спартсменаў, вельмі цікавыя. З апошняга — удзел у Кубку Рэспублікі Беларусь па парашутна-атлетычным мнагабор'і.

Штогод парашутысты праходзяць медкамісію, некаторыя не атрымліваюць дазвол на далейшыя заняткі па стане здароўя і таму сыходзяць са спорту. Таксама перад кожным сезонам трэба здаваць залікі і нарматывы. Да дзяўчат, якіх у аэраклубе меншасць, прад'яўляюцца тыя ж патрабаванні, што і да хлопцаў.

— Страху не прайсці медкамісію не было ніколі, бо здароўе ў мяне вельмі добрае. Увогуле сама па сабе я спрытная дзяўчына. Да захаплення скачкамі з парашутам займалася, як і брат, пешаходным турызмам, наведвала розныя гурткі. Мне падабаецца спрабаваць нешта новае. Скажу шчыра, кожны год я вырашаю, заставацца ў гэтым спорце ці не, бо часта адчуваю хваляванне, такі ў мяне тэмперамент. Ну, і трэба аддаваць яму шмат асабістага часу. Калі з'явіцца сям'я, думаю, будзе цяжэй, але, з іншага боку, без скачкоў таксама сумую, такі спорт дае мне веру ў сябе, упэўненасць і ўсведамленне, што не кожны можа займацца ім, а я — змагла.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота дадзена героямі.**

*Свой выбар*

# ЗАЦІКАВІЦЬ БІЯЛОГІЯЙ І ГЕАГРАФІЯЙ

## А яшчэ — знайсці да дзетак падыход

**Марыя ДЗЕГЦЯРОВА з вёскі Ламавічы Акцябрскага раёна — малады спецыяліст, больш за год яна працуе настаўніцай у школе № 2 у аднайменным гарпасёлку. У Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка на спецыяльнасць «Біялогія і геаграфія» дзяўчына паступіла яшчэ ў 2013 годзе, аднак сыходзіла ў акадэмічны адпачынак у сувязі з нараджэннем дзіцяці, таму скончыла ВНУ толькі летась.**

— Стаць настаўнікам было не спантанным рашэннем, у маёй сям'і цэлая дынастыя. Мама — педагог дашкольнай адукацыі, амаль усё жыццё працуе ў дзіцячым садку, стрыечныя браты і сёстры, якіх пяцёра, — таксама настаўнікі. Да таго ж, калі яшчэ вучылася ў школе, удзельнічала ў розных алімпіядах, мне падабалася тое, як даюць веды педагогі, брала з іх прыклад. Ну і галоўнае, я вельмі люблю дзяцей. А гэта, лічу, адна з самых важных якасцяў у нашай прафесіі. Першы курс вучобы ва ўніверсітэце, як і для кожнага былога школьніка, здаваўся тым яшчэ квэстам, аднак хутка прызвычаілася да шматлікіх дысцыплін і амаль поўнай адсутнасці вольнага часу. Цяпер пра той перыяд успамінаю толькі з цеплынёй. Практыку праходзіла ў розных школах Мінска і Мінскага раёна. Падчас наладжвання стасункаў з дзецьмі, правядзення ўрокаў ніякага бар'еру не было. Яны лічылі мяне настаўнікам, а не сяброўкай. Для мяне гэта вельмі важна, паколькі на той момант я была не нашмат старэйшай за іх. Таксама карысным вопытам аказалася летняя практыка ў лагеры, якую праходзіла ў родным Акцябрскім раёне. Тады яшчэ раз



пераканалася, што абрала прафесію правільна.

Дваццацічатырохгадовая дзяўчына брала мэтавае накіраванне, таму ведала, што пасля заканчэння ВНУ вернецца дадому на адпрацоўку. У якой школе Марыя будзе выкладаць, вызначылася яшчэ на чацвёртым курсе вучобы.

— Калі пачаўся мой першы навучальны год у якасці настаўніка, было хваляванне: як прымуць калегі, як лепш сябе паводзіць, як дзеці будуць да мяне ставіцца. Але страх прайшоў, калі ўбачыла, што новы калектыў добразычлівы. Першапачаткова я выкладала біялогію ў вучняў шостых-адзінаццатых класаў, з пачатку бягучага навучальнага года — геаграфію. Нагрузка немаленькая, але мне гэта падабаецца. Па-за гадзінамі ўрокаў — розныя гурткі, факультатывы. Напрыклад, па суботах праводжу гурток «Юны эколаг», ён вельмі даспадобы дзецям. Разам вывучаем экалогію нашай і іншых краін, праводзім эксперыменты. Да таго ж удзельнічаем у розных праектах, напрыклад, у конкурсе навуковых работ «Пошук». Таксама за школай замацаваны вучні, якія знаходзяцца на дамашнім навучанні. Менавіта ў мяне такіх два.

Працоўны дзень у маладога спецыяліста пачынаецца даволі рана, у восем гадзін раніцы настаўніца ўжо павінна знаходзіцца на сваім месцы. Падрыхтаваць дошку, раскласці па партах атласы, карткі, тэсты, павесіць геаграфічную карту...

— Сёлета мне далі класнае кіраўніцтва ў пятым класе. Папрацаваўшы з дзецьмі яшчэ зусім няшмат, разумею, што мне вельмі пашанцавала. Праводжу з імі шмат часу і бачу, што няма спалоханых вачэй, яны мне давяраюць. Школьнікі актыўныя, хочуць даведацца штосьці новае, мая задача — не толькі скіроўваць іх у правільны бок, але і аказваць псіхалагічную падтрымку, бо не ўсе яны знаходзяцца на адным узроўні ведаў, але, напэўна, усе хочуць адчуваць сябе аднолькава добра ў калектыве. Да таго ж кожны мае свой характар, і таму заўсёды трэба знайсці пэўны падыход. Настаўніку важна ўбачыць гэта яшчэ на пачатковым этапе работы са школьнікамі, каб падабраць методыку выкладання матэрыялу. Таксама я імкнуся разглядзець у дзецях патэнцыял. Напрыклад, займаюся з хлопчыкамі і дзяўчатамі алімпіядным рухам, атрымліваю ад гэтага задавальненне. А яшчэ лічу, што маладым спецыялістам вельмі важна звяртаць увагу на тое, як правільна весці дакументацыю, каб потым было менш пытанняў і няўпэўненасці.

Марыя перакананая: самае важнае ў прафесіі — удзячныя вочы дзяцей і іх павага да настаўніка. «Вельмі прыемна, калі ў канцы заняткаў яны кажуць: «Дзякуй, Марыя Вячаславаўна, што правялі такі цікавы ўрок», гэта надае сіл. Дарэчы, пасля адпрацоўкі пераязджаць нікуды не планую, тут мая сям'я, любімая работа, добрыя ўмовы для самарэалізацыі і жыцця».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота дадзена гераіняй.**

**• Даведка**

**Выконваючы абавязкі начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама Карына КУРСЕВІЧ:**

— Сёлета раён атрымаў 67 маладых спецыялістаў. У сферы адукацыі — 21, сельскай гаспадаркі — 19, ахове здароўя — 10, культуры — 6, гандлю — 8, прамысловасці — 3. Ім выплачаны пад'ёмныя, дадзена жыллё па найме або арэнднае. У нашым аддзеле створаны банк даных маладых спецыялістаў і працоўнай моладзі, арганізавана работа тэлефоннай «гарачай лініі», каб аказваць садзейнічанне ў вырашэнні актуальных пытанняў. Штогод праводзім аналіз ратацыі маладых спецыялістаў, сёлета замацаванне маладых кадраў склала 80,1 працэнта, у мінулым годзе гэты паказчык быў на ўзроўні 79 працэнтаў. Прычыны адтоку маладых спецыялістаў розныя: прызыў ва Узброеныя Сілы, пераразмеркаванне, паступленне ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, змена месца жыхарства і іншыя.

*Друкуецца ў «Маладосці»*

Аляксандр БОГДАН

# ЭВАЛЮЦЫЯ, ДЗЕЦІ БОЖЫЯ!

**Пастаянны аўтар пастаяннай «маладосцеўскай» рубрыкі «З Богам» айцец Аляксандр Богдан жыве і служыць у Ваўкавыску. За час існавання рубрыкі (якая акурат адзначыла пяць гадоў) ім напісана нямала актуальных артыкулаў на духоўныя тэмы. З нагоды юбілею рубрыкі чытачам «Чырвонкі. Чырвонай змены» прапануецца паразважаць на адну з самых неўміручых тэм.**



«Гагарын у космас лятаў, але Бога там не бачыў», — заявіў Мікіта Хрушчоў. Свяшчэннік жа дадаў: «А Бог яго бачыў і благаславіў».

Мо час ужо ўключыць разважаннасць? Ці гэта ўвайшло ў азарт — спрачацца з навукай? Насамрэч біялагічная навука не лезе ў пытанні хрысціянства. Дык можа і недасведчаным у біялогіі хрысціянам не варта ганьбіць сябе перад навукоўцамі, спрабуючы даказаць ім, што ў нечым яны памыліліся?

Я не біёлаг і зусім не навуковец, таму не буду расказваць пра тое, што ёсць тэорыя эвалюцыі. Не буду адказваць і на збітае пытанне: «Чаму цяпер малпы не ператвараюцца ў людзей?» Амаль усе, хто пытаецца, абсалютна ўпэўненыя, што гэтым яны абвяргаюць эвалюцыйную тэорыю. У такіх выпадках я раю спытаць не свяшчэнніка, а біёлага. І неабавязкова шукаць навукоўца з сусветным імем. Расказаць, чаму цяпер малпы не ператвараюцца ў людзей, можа і настаўніца біялогіі. Шкада, што ў школьнай праграме вельмі мала ўвагі надаецца гэтай тэме. Магчыма, калі б вучні атрымлівалі больш ведаў, ніхто б такіх бязглуздых пытанняў не задаваў. Калі ж паглыбіцца хоць бы трохі ў тэму эвалюцыі, не абмяжоўваючыся школьным падручнікам біялогіі, стане зразумела, чаму падобныя выказванні выклікаюць у выпускнікоў біяфака ўсмешку. І няважна, вернікі яны ці атэісты.

Пра эвалюцыю навукоўцы пішуць не толькі навуковыя працы, але і навукова-папулярныя кнігі. Вось, напрыклад, генетык Джэры Койн у прадмове да кнігі «Эвалюцыя. Неабвержныя доказы» піша наступнае: «Хоць для прызнання вялізнай ролі эвалюцыі сапраўды патрабуецца моцна змяніць мысленне і светапогляд, аднак гэта зусім не вядзе да кашмарных наступстваў, якімі крэацыяністы любяць палохаць публіку, адварочваючы яе ад дарвінізму.

Прыняўшы эвалюцыю, вы не станеце адчайным нігілістам і не страціце мэту і сэнс жыцця. Вы не ператворыцеся ў амаральную пачвару, Сталіна або Гітлера, і не падхопіце атэізм, таму што вольныя ад забабонаў вернікі заўсёды знаходзілі спосаб прыняць дасягненні навукі. Насамрэч здольнасць зразумець эвалюцыйны працэс, несумненна, пашырае і паглыбляе разуменне свету і нашага месца ў ім. Ісціна — тое, што вы ўсе, падобна львам, секвоям і жабкам з'явіліся дзякуючы паслядоўнай замене аднаго гена іншым, пакрокаваму нарошчванню маленькіх эвалюцыйных пераваг, — саграв**а**е душу нашмат больш, чым міф пра тое, нібыта мы раптам з'явіліся на свет з ніадкуль...

Не ведаю, як іншым хрысціянам, але мне не давялося мяняць сваё мысленне.

На маю веру не ўплываюць факты пра паходжанне чалавека. Справа ў тым, што я веру ва ўсёмагутнага Бога, які папросту мог стварыць чалавека з малпы. Нехта мне можа пярэчыць: у Бібліі, маўляў, не напісана ні пра якую малпу! Так. Таму што аўтар біблейскага тэксту ставіў мэту паказаць не тое, чые мы нашчадкі, а тое, што мы, людзі, — дзеці Божыя. Пагаджуся, некаторыя навуковыя адкрыцці могуць шакіраваць не толькі вернікаў. Памятаю дыялог, які ў мяне адбыўся з адной прыхаджанкай.

— Ну не! — сказала яна. — Не магу прызнаць, што я паходжу ад малпы. Я веру, што мяне стварыў Бог!

— А як вас стварыў Бог? — спытаў я.

— Не ведаю, але дакладна не з малпы.

Тут можна прывесці наступную аналогію.

Майстра кажа:

— Гэты стол зроблены з ліпы. Калі ўважліва прыглядзецца, то можна нават даведацца, у якім лесе ліпа расла...

— Што ён вярзе?! Што за лухта?! — абураецца ўладальнік стала. — Гэты стол зрабіў мой бацька! Сваімі рукамі!

Спадзяюся, чытачу зразумела, што рэлігія і навука папросту глядзяць на чалавека пад рознымі вугламі.

Часам мяне папракаюць: я, маўляў, у эвалюцыю веру. А я не разумею, як у эвалюцыю можна верыць. Можна верыць у Бога, Дзеда Мароза, лёс... А як можна верыць у навуковую тэорыю — эвалюцыі, адноснасці, геліяцэнтрызму?.. Хіба нехта верыць, што сума ўнутраных вуглоў трохвугольніка складае 180 градусаў? У гэта ніхто не верыць: гэта ўсе ведаюць.

Сярод праваслаўных я сустракаў тых, хто сцвярджаў: тэорыя эвалюцыі — гэта не навуковая тэорыя, а ледзь не адна з формаў рэлігіі. Ну, гледзячы для каго. Напрыклад, для навукоўцаў яна навуковая, а для іншых, можа, не толькі. Але не навукоўцы робяць яе рэлігіяй. Увогуле, рэлігійны кантэкст пры жаданні можна надаць нават простаму матэматычнаму ўраўненню. Але ці трэба?

Часам мне нават упэўнена так заяўляюць, што сярод крытыкаў тэорыі эвалюцыі ёсць і біёлагі. Тут я звычайна задаю наступныя пытанні: а, можа, ёсць дыпламаваныя хімікі, якія не прызнаюць табліцу Мендзялеева? Можа, ёсць дыпламаваныя матэматыкі, якія не прызнаюць табліцу множання?

Людзей, што займаюцца навукай, дзеляць на фізікаў, хімікаў, біёлагаў і г. д. Тых, хто займаецца філасофіяй, падзяляюць на матэрыялістаў, экзістэнцыялістаў і г. д. Дык вось, філасофстваваць можа нават біёлаг. Яркім прыкладам служыць брытанец Рычард Докінз. Ён філасофствуе, і ў яго філасофіі ёсць, канешне, канфлікт з рэлігіяй. А вось няверуючы антраполаг і папулярызатар навукі Аляксандр Сакалоў займаецца чыста навуковымі даследаваннямі, і ў іх няма канфлікту з хрысціянствам. Ва ўсякім разе мне ён сказаў, што іх не бачыць.

Цікава яшчэ, што ёсць і веруючыя філасофы-эвалюцыяністы. Самы вядомы — айцец П'ер Тэйяр дэ Шардэн (1881—1955). Французскі каталіцкі святар, тэолаг, геолаг, які зрабіў шмат для палеанталогіі і антрапалогіі. Канешне, хтосьці з яго філасофіяй не пагаджаецца, нехта крытыкуе. Зрэшты, як і многіх іншых філосафаў. Рычард Докінз, дарэчы, не выключэнне.

Падчас даследаванняў у прыродазнаўстве не прынята спасылацца на Біблію. Для гэтага ёсць іншая кніга — прырода. Пра дзве гэтыя кнігі пісаў яшчэ Ламаносаў: «Создатель дал роду человеческому две книги. В одной Он показал Свое величество, а в другой Свою волю. Первая — видимый сей мир, Им созданный, чтобы человек, смотря на огромность, красоту и стройность Его зданий, признал Божественное всемогущество по мере себе дарованного понятия. Вторая книга Священное Писание... Не здраво рассудителен математик, ежели он хочет Божескую волю вымерять циркулем. Так же и богословия учитель, если он думает, что по псалтири научиться можно астрономии или химии».

